Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (121), 2020

*УДК 94:341.222(476):94:327.5(438+(47+57))"1919-1920"*

# Пытанне граніц Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны 1919–1920 гг.

М.М. Мязга

У артыкуле разгледжаны ўплыў польска-савецкай вайны на вырашэнне пытання аб вызначэнні граніц БНР і ССРБ і іх прызнанні міжнароднай супольнасцю. Зроблена выснова, што як палітыка Савецкай Расіі, так і Польшчы была неспрыяльнай для ўсталявання граніц беларускіх дзяржаўных утварэнняў. Палітыка названых дзяржаў стала адным з важнейшых фактараў, якія абумовіў захаванне ССРБ на момант заканчэння польска-савецкай вайны ў складзе толькі шасці паветаў, і не дазволіў БНР устанавіць рэальны кантроль над якой-небудзь часткай тэрыторыі Беларусі. Тым самым не была вырашана задача стварэння Беларускай дзяржавы ў этнічных граніцах.
**Ключавыя словы:** польска-савецкая вайна, Беларусь, БНР, ССРБ, ЛітБелССР, Польшча, Савецкая Расія, граніца, тэрытарыяльнае пытанне, федэрацыя, інкарпарацыя, Рыжскі мір.

The author considers the influence of the Polish-Soviet war on the issue of BNR and SSRB borders defining and their recognition by the international community. It is concluded that the policy of both Soviet Russia and Poland was unfavorable for the establishment of the Belarusian state entities borders. The policy of these states became one of the most important factors that led to the preservation of SSRB at the end of the Polish-Soviet war consisting of only six counties, and did not allow BNR to establish real control over any part of the territory of Belarus. So the problem of Belarusian state creating within ethnic borders was not solved.
**Keywords:** Polish-Soviet war, Belarus, BNR, SSRB, Litbel, Poland, Soviet Russia, border, territorial issue, federation, incorporation, Riga Peace Treaty.

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. аказала істотны ўплыў на працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці пасля Першай сусветнай вайны, у тым ліку на вырашэнне пытання аб граніцах дзяржаўных утварэнняў, якія спрабавалі ўсталявацца ў тыя гады на беларускіх землях. Улічваючы пазіцыі суседніх дзяржаў па тэрытарыяльнаму пытанню, БНР і ССРБ было дастаткова праблематычна дабіцца рэальнага ўсталявання тых граніц, у якіх яны былі абвешчаны. БНР сутыкнулася з праблемай захавання цэласнасці беларускіх земляў яшчэ ў сувязі з заключэннем Брэсцкага мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і краінамі германскага блока. Ужо пры распрацоўцы гэтага дакумента яскрава абазначылася пазіцыя бальшавікоў, якія лічылі сябе ў праве распараджацца беларускімі землямі як часткай тэрыторыі Расіі. У дадзеным артыкуле ставіцца задача высветліць, як умовы польска-савецкай вайны ўплывалі на вырашэнне пытання аб усталяванні і прызнанні міжнароднай супольнасцю граніц БНР і ССРБ, у якіх яны былі абвешчаны.

Абвяшчэнне ССРБ адбылося ў час, калі станавілася відавочным наспяванне польска-савецкага ваеннага канфлікту, у цэнтры якога была тэрытарыяльная спрэчка. Як вядома, Савецкая Беларусь была абвешчана ў складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў. Але ў такіх межах яна праіснавала зусім нядоўга. Звязана гэта з тым, што рэспубліка стваралася як буферная паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. На сённяшні дзень тэзіс аб буферным характары ССРБ атрымаў значнае распаўсюджванне ў беларускай гістарыяграфіі [1], [2]. Існуюць пэўныя разыходжанні адносна прызначэння гэтага буфера. На наш погляд, ён разглядаўся бальшавікамі не столькі як бар'ер супраць Польшчы, а як прастора для пошуку часовага кампрамісу з Польшчай за кошт тэрытарыяльных саступак ёй. Па сутнасці, аб гэтым гаварыў прадстаўнік ЦК РКП(б) у Беларусі А. Іофе на пасяджэнні Цэнтральнага Бюро КПБ(б) 22 студзеня 1919 г., калі заявіў, што прэтэнзіі польскага імперыялізму могуць быць вырашаны дыпламатычным шляхам, для чаго было неабходна, каб Польшча сутыкнулася з буферамі і для чаго стваралася Беларуская ССР. І далей ён адзначыў, што «неадкладнае ўключэнне Беларускай рэспублікі ў Савецкую Расію на правах федэрацыі знішчае ўсе выгоды ад стварэння буфераў-рэспублік, бо тады ўсе перамовы вядзе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

цэнтральны ўрад, гэта значыць самой Расіі прыйдзецца непасрэдна прымаць у іх удзел» [3, с. 205]. У пачатку 1919 г. расійскі савецкі ўрад гатовы быў ісці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі за кошт савецкіх буферных рэспублік дзеля атрымання мірнай перадышкі на захадзе ва ўмовах цяжкага становішча на франтах грамадзянскай вайны з «белымі» генераламі. Той жа А. Іофе на пасяджэнні ЦК КП(б)ЛіБ 5 красавіка 1919 г. адзначыў: «… за мір з Антантай можна аддаць Літву і Беларусь» [3, с. 265]. Такім чынам, тэрытарыяльная цэласнасць ССРБ была пастаўлена бальшавікамі пад сумненне практычна з моманту яе абвяшчэння.

У сувязі з той роллю, якую бальшавікі адводзілі ССРБ ва ўмовах наспяваўшай вайны з Польшчай, становіцца зразумелым іх рашэнне аб передачы ў склад Савецкай Расіі Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Гэта выключала рызыку страты названых тэрыторый на карысць Польшчы ў выпадку, калі б справа дайшла да тэрытарыяльных саступак ёй за кошт ССРБ. Як справядліва заўважыў у сваім даследаванні С. Хоміч, «маючы магчымасць ахвяраваць беларускімі землямі, бальшавікі не хацелі рызыкаваць усімі тэрыторыямі, заўчасна ўключаючы большую іх частку ў склад РСФСР» [4, с. 45]. У. Ленін прама ўказваў, што Беларуская рэспубліка патрэбна пастолькі, паколькі яна мяжуе з іншымі краінамі. Паколькі Смаленск, Віцебск і Магілёў не мяжуюць, то іх можна выключыць са складу ССРБ [3, с. 209]. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) прыняў адпаведнае рашэнне. Адзначым, што ў кіраўніцтве РСФСР меліся пэўныя разыходжанні па пытанні адарвання ад ССРБ трох усходніх губерняў. Найбольш актыўным яго прыхільнікам выступаў Я. Свярдлоў, лінію якога ў Мінску праводзіў А. Іофе. А вось наркам замежных спраў Г. Чычэрын лічыў дадзенае рашэнне памылковым. Ён 26 студзеня 1919 г пісаў А. Іофе: «Аддзяленне трох губерняў, пасля якога фактычна ў распараджэнні Беларусі засталася толькі Мінская губерня, ці не ідзе гэта занадта далёка? ... Яшчэ можна было б зразумець некаторую карэктыроўку тэрыторыі за кошт частак Смаленскай і Віцебскай губерняў, памылка ж на 75 працэнтаў недапушчальна» [5, с. 121].

Не спрыяла захаванню тэрытарыяльнай цэласнасці ССРБ і пазіцыя Польшчы. Польская палітычная эліта ў сваё палітыцы ў дачыненні да беларускіх зямель зыходзіла з тэзіса аб наяўнасці ў Польшчы гістарычных правоў на дадзеныя тэрыторыі. Гэта ў роўнай ступені датычылася як тых польскіх палітыкаў, што прытрымліваліся канцэпцыі федэрацыі, так і тых, хто адстойваў палітыку інкарпарацыі. Але пры гэтым у польскай палітычнай эліце мелася разуменне таго, што за час, які прайшоў пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, на тэрыторыі «ўсходніх крэсаў» адбыліся істотныя этнакультурныя змены, і вяртанне да граніц 1772 г. шляхам прамога ўключэння «ўсходніх крэсаў» у склад Польшчы з'яўляецца немагчымым. У ноце, накіраванай да камісіі Камбона на Парыжскай мірнай канферэнцыі, кіраўнік польскай дэлегацыі Р. Дмоўскі адзначаў, што на працягу «мінулых 150 гадоў з моманту падзелу Польшчы на нашых усходніх межах адбыліся змены, з якімі мы павінны лічыцца». Мелася на ўвазе развіццё нацыятворчых працэсаў. У ноце падкрэслівалася, што ўключэнне вялікіх тэрыторый на ўсходзе «не прынесла б карысці будучай Польшчы. Мы зусім не хочам уключаць у склад нашай дзяржавы элементы, якія немагчыма асімілюваць». У сувязі з гэтым Польшча, па словах Р. Дмоўскага, «адмаўлялася» ад усёй Кіеўскай, амаль ад усёй Падольскай, большай часткі Валынскай, ад усёй Магілёўскай, большай часткі Віцебскай, двух паветаў Віленскай губерняў [3, с. 228]. Пазіцыя польскай дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі па пытанні ўсходняй граніцы зводзілася да адстойвання «лініі Дмоўскага», якая была прынята Польскім Нацыянальным Камітэтам (ПНК) на завяршальным этапе Першай сусветнай вайны. Яна прадугледжвала праходжанне ўсходняй граніцы Польшчы па лініі Вільня, Дзвінск, Мінск, Пінск, Роўна, Камянец-Падольскі. У склад Польшчы павінны былі ўвайсці губерні Ковенская, Віленская, Гродзенская, большая частка Мінскай, Валынь, два паветы Падольскай губерні [6, s. 54, 56]. Тым самым, каля паловы беларускіх тэрыторый намячалася ўключыць у склад Польшчы непасрэдна. У ПНК пераважалі прадстаўнікі польскага правага палітычнага лагера і, адпаведна, прыхільнікі канцэпцыі інкарпарацыі. Але «лінія Дмоўскага» як лінія польскай усходняй граніцы знайшла, па сутнасці, падтрымку і з боку Ю. Пілсудскага. У снежні 1918 г. у Варшаве адбыліся перамовы начальніка дзяржавы і прыбыўшага сюды прадстаўніка ПНК

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

С. Грабскага. Апошні 16 снежня паведаміў ПНК, што Ю. Пілсудскі выказаўся за граніцу, якая павінна праходзіць па лініі Ула, Бярэзіна, Случ, Гарынь. Гэта было блізка да «лініі Дмоўскага» [3, с. 185]. Блізкі паплечнік Ю. Пілсудскага Л. Васілеўскі адзначаў, што «ў адносінах усходняй граніцы Пілсудскі ў цэлым пагаджаўся з лініяй, прапанаванай Дмоўскім» [7, s. 172]. Такім чынам, БНР і ССРБ у сваім імкненні ўсталявацца ў этнічных беларускіх граніцах непазбежна давялося б сутыкнуцца з супрацьдзеяннем з боку Польшчы.

З пачаткам польска-савецкай вайны ў польскіх правячых колах працягвалася абмеркаванне пытання аб усходняй граніцы краіны. У красавіку – маі 1919 г. у заявах польскіх палітычных дзеячаў гучыць падтрымка ідэі федэрацыі. Пасля заняцця польскай арміяй Вільні Ю. Пілсудскі 22 красавіка выступіў з вядомай адозвай да жыхароў былога ВКЛ, у якой гаварылася аб іх праве самім вызначаць свой лёс. 22 мая прэм'ер-міністр І. Падарэўскі заявіў, што Польшча не адмаўляе літоўцам, беларусам і ўкраінцам у праве на незалежнасць, а канчатковыя межы Польшчы будуць вызначаны на мірнай канферэнцыі [3, с. 301]. 4 мая 1919 г. Ю. Пілсудскі пісаў Л. Васілеўскаму аб недапушчальнасці падзелу Беларусі паміж Польшчай з Расіяй [8, s. 75–76]. 5 чэрвеня ў звароце да ўдзельнікаў Парыжскай канферэнцыі прэм'ер-міністр Польшчы заявіў, што яго краіна прызнае права народаў былога ВКЛ на самавызначэнне і імкнецца да аб'яднання з імі «на аснове агульных палітычных, эканамічных і культурных інтарэсаў» [3, с. 303]. Як бачым, гаворка ішла аб федэрацыі, у рамках якой і павінна было вырашацца пытанне аб граніцах дзяржаў, якія павінны былі яе ўтварыць.

Летам – восенню 1919 г. пазіцыя польскага ўрада адносна ўсходняй граніцы краіны больш канкрэтызуецца. У інструкцыі польскага МЗС ад 7 ліпеня 1919 г. гаварылася, што Польшча павінна пакінуць за сабой толькі тую частку зямель, «якія з'яўляюцца этнаграфічна польскімі, або маюць досыць значны працэнт польскага насельніцтва, з'яўляюцца польскімі цывілізацыйна». Далей гаварылася аб магчымасці далучэння да Польшчы ўсёй або нязначана зменшанай тэрыторыі былога ВКЛ «пры дапамозе ўніі ці федэрацыі» [3, с. 330]. Тым самым федэрацыя фактычна выступае як інструмент усталявання польскага кантролю над землямі, якія не ўвойдуць непасрэдна ў склад Польшчы. Як бачна, нават палітыка федэрацыі, не гаворачы ўжо аб інкарпарацыі, не прадугледжвала згоды Польшчы на ўтварэнне беларускай дзяржавы ў этнічных граніцах. Восенню 1919 г. Ю. Пілсудскі адыходзіць ад палітыкі федэрацыі. У перамовах з беларускімі дзеячамі, якія ён меў у гэты час у Мінску і Варшаве, гаворка ішла аб стварэнні толькі «беларускага П'емонта» з правамі культурнай аўтаноміі на тэрыторыі, якая ўключала б Мінск і землі на ўсход ад яго. Астатняя беларуская тэрыторыя павінна была непасрэдна ўвайсці ў склад Польшчы [9, s. 185–186].

Пытанне аб граніцах Беларусі набыло новае гучанне ў сувязі з савецкімі мірнымі прапановамі Польшчы зімой – вясной 1920 г. 8 сакавіка 1920 г. на пасяджэнні польскага ўрада з удзелам Ю. Пілсудскага абмяркоўвалася пытанне аб тым, якую пазіцыю павінна заняць Польшча на магчымых перагаворах з бальшавікамі. Было прынята рашэнне дабівацца непасрэднага ўключэння Гродзеншчыны і Віленшчыны ў склад Польшчы, а ў «Мінскай акрузе і на атрыманых далей на ўсход землях трэба зрабіць беларусам саступкі ў галіне самакіравання і культуры» [10, с. 125]. Аднак як далёка на ўсход пройдзе граніца гэтай акругі вызначана не было. Гэтыя польскія планы ў адносінах да Беларусі не сустракалі супрацьдзеяння з расійскага боку. Зыходзячы з прапаноў, якія ўтрымліваў зварот савецкага ўрада да польскага адносна пачатку мірных перамоў, можна зрабіць выснову аб гатоўнасці Масквы ісці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі Польшчы за кошт Беларусі [11, с. 232]. Гэтыя саступкі савецкі ўрад лічыў часовымі. Такая пазіцыя Масквы абазначылася яшчэ ў час перамоў Ю. Мархлеўскага з прадстаўнікамі Ю. Пілсудскага летам – восенню 1919 г. Савецкі прадстаўнік у час іх заявіў, што «пытанне граніц не прадстаўляе ніякіх цяжкасцей, … савецкі ўрад і тут пойдзе на саступкі і пагадзіцца, каб па пытанні прыналежнасці да Польшчы ці савецкай рэспублікі галасавала ўсё насельніцтва спрэчных тэрыторый» [12, с. 12].

Гатоўнасць Савецкай Расіі ісці на значныя тэрытарыяльныя саступкі Польшчы летам 1920 г. працягвала дыктавацца інтарэсамі вайны з ёю. 12 ліпеня 1920 г. быў падпісаны савецка-літоўскі мірны дагавор. Па ім значныя беларускія тэрыторыі Гродзеншчыны і Віленшчыны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адыходзілі да Літоўскай рэспублікі. Гэта была плата ўрада Леніна літоўцам за падтрымку ў барацьбе з Польшчай. І гэта было прызнанне Савецкай Расіяй таго факта, што ЛітБелССР спыніла сваё існаванне, а значаная частка яе тэрыторыі пераходзіла да «буржуазнай» Літвы.

На вырашэнне пытання аб граніцах Беларусі ў выглядзе паўторна абвешчанай ССРБ аказвала уплыў і наступленне Чырвонай Арміі летам 1920 г., калі ў бальшавікоў зноў з'явілася надзея на распальванне рэвалюцыі ў Польшчы і далей у Еўропе. Тэрытарыяльнымі саступкамі за кошт Беларусі на карысць Польшчы бальшавікі разлічвалі падштурхнуць польскае насельніцтва да больш лаяльнага стаўлення да Чырвонай Арміі, якая несла на сваіх штыках сацыялістычную рэвалюцыю. 15 чэрвеня У. Ленін у адным са сваіх лістоў прапаноўваў заявіць «надзвычай урачыста, што забяспечваем польскім рабочым і сялянам граніцу ўсходней той, якую дае Керзан і Антанта» [13, с. 303]. У тэзісах Пленума ЦК РКП(б) ад 16 ліпеня 1920 г. гаварылася: «РСФСР пойдзе ў адносінах міра тым шырэй насустрач усім інтарэсам і патрэбам Польшчы, чым хучэй і больш рашуча працоўныя масы Польшчы ўстановяць у сябе такі парадак, які вызваліць іх ад ролі інструмента французскіх, англійскіх і іншых капіталістаў і створыць асновы для сапраўды братэрскіх адносін паміж Раб.-Сялянс. Польшчай, Расіяй і Украінай» [14, с. 142].

Ужо пачатак мірных перамоў паміж Савецкімі Расіяй і Украінай і Польшчай паказаў, што абодва бакі не маюць намеру лічыцца з тэрытарыяльнай цэласнасцю Беларусі. 27 жніўня 1920 г. на пасяджэнні Рады абароны дзяржавы (РАД) было прынята рашэнне, што Польшча будзе дабівацца граніцы па лініі Дзвінск – Вільня – Баранавічы – Лунінец – р. Гарынь – р. Збруч, паколькі на ёй знаходзяцца гатовыя інжынерныя збудаванні. Гэтую мяжу падтрымаў і Ю. Пілсудскі. Дадзеная лінія граніцы была пацверджана на пасяджэннях РАД 11 і 25 верасня. Прычым на апошнім пасяджэнні была зроблена агаворка, што гэта лінія мінімальных патрабаванняў, і канчатковае рашэнне павіна прымаць дэлегацыя непасрэдна на перамовах [15, с. 116, 120, 121]. Польская дэлегацыя настойвала на перадачы Польшчы чыгункі Сарны – Лунінец – Баранавічы – Ліда і шырокай паласы на паўночны ўсход ад яе. У якасці альтэрнатывы прапаноўваўся вывад усіх замежных войскаў с тэрыторыі Беларусі і абвяшчэне яе незалежнасці з заходняй граніцай па «лініі Керзана» [16, с. 10]. Частка членаў польскай дэлегацыі не страціла надзеі на рэалізацыю федэралісцкай канцэпцыі і выступала за ўключэнне ў склад Польшчы Мінска. Але гэты пункт гледжання не знайшоў падтрымкі большасці [17, с. 265, 295].

Савецкая Расія яшчэ на мінскім этапе перамоў праявіла гатоўнасць пайсці на тэрытарыяльныя саступкі Польшчы. Прыбыўшы ў Мінск К. Радак заявіў, што з граніцай праблем не будзе пры ўмове прызнання Польшчай Савецкай Украіны [18, s. 51]. З пачатку верасня Масква ўзяла курс на г. з. згодніцкі мір з Польшчай, у аснове якога былі тэрытарыяльныя саступкі за кошт Беларусі. Палітбюро на пасяджэнні 1 верасня прыняло рашэнне аб змене складу савецкай дэлегацыі на перамовах з Польшчай [19, с. 8–9]. 20 верасня пленум ЦК РКП(б) даручыў камісіі ў складзе К. Радака, Л. Каменева, Г. Чычэрына распрацаваць праект дэкларацыі УЦВК па польска-савецкіх перамовах. У гэтыя ж дні У. Ленін пісаў А. Іофе аб магчымасці пайсці на тэрытарыяльныя саступкі Польшчы і згадзіцца на граніцу па лініі р. Шчара – канал Агінскага – р. Ясельда, прапанаваную глаўкамам С. Каменевым, пры ўмове, што мір будзе падпісаны на працягу 10 дзён [19, с. 59]. Курс на дасягненне пагаднення з Польшчай на аснове тэрытарыяльных саступак быў канчаткова замацаваны ў заяве УЦВК ад 23 верасня 1920 г. У ёй гаварылася аб гатоўнасці савецкага боку ісці на значныя тэрытарыяльныя саступкі пры ўмове падпісання міру ў бліжэйшы час [20, с. 400–401]. Некалькі пазней у выступленні на сесіі УЦВК па пытанні ратыфікацыі прэлімінарнага дагавора з Польшчай Г. Чычэрын даў наступную характарыстыку савецкай пазіцыі на перамовах: «Мы прапанавалі Польшчы тэрытарыяльныя прырашчэнні за адмову Польшчы ад палітыкі буферызму» [17, с. 213–214]. У ходзе далейшых перамоў расійская савецкая дэлегацыя ішла на новыя тэрытарыяльныя саступкі, перадаючы Польшчы землі ССБР, незалежнасць якой Масква юрыдычна прызнала і фармальна не магла распараджацца яе тэрыторыяй. Але тэрытарыяльныя саступкі за кошт Беларусі з'яўляліся платай РСФСР за хуткі мір з Польшчай, да чаго ў той момант імкнуўся ўрад У. Леніна, і за прызнанне палякамі савецкай формы дзяржаўнасці на Украіне. 2 кастрычніка палітбюро прыняло рашэнне «згадзіцца на лінію, якая аддае Польшчы чыгунку

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Ліда – Баранавічы, пры ўмове, што мір (і перамір'е) будзе падпісаны ў самы кароткі тэрмін (3 дні прыкладна)». У той жа дзень Г. Чычэрын паведаміў А. Іофе аб гэтым рашэнні [21, с. 396–397]. 9 кастрычніка палітбюро прыняло рашэнне ісці на далейшыя саступкі палякам пры ўмове неадкладнага падпісання мірнага дагавора, аб чым зноў быў праінфармаваны А. Іофе [17, с. 213–214]. Менавіта на гэтым грунце былі падпісаны як папярэдняя, так і канчатковая дамовы ў Рызе.

Ход мірных перамоў з Польшчай рашаючым чынам уплываў і на пазіцыю Савецкай Расіі па пытанні ўсходняй граніцы ССРБ. Масква лічыла ў тагачасных умовах немэтазгодным далучэнне да Савецкай Беларусі Віцебскай і Гомельскай губерняў, бо, як пісаў Г. Чычэрын, «мы яшчэ не ведаем, праз якія перапіцці можа прайсці лёс Беларусі і павялічваць загадзя тую тэрыторыю, якая праз гэтыя перапіцці будзе праходзіць, было б крайне неасцярожна» [17, с. 247]. Бальшавікі не былі ўпэўнены ў трываласці сваіх пазіцый на Беларусі, у тым, што ССРБ захаваецца. 17 лістапада ў Маскве адбылася нарада з удзелам кіраўнікоў ССБР А. Чарвякова, В. Кнорына, на якой разглядалася пытанне «аб тэрыторыі Савецкай Беларусі». У прынятай пастанове канстатавалася: «...прызнаць у сучасны момант несваечасовасць вырашэння гэтага пытання» [22, с. 140]. 18 лістапада палітбюро ЦК РКП(б) адобрыла рашэнне, прынятае па беларускім пытанні на ўказанай нарадзе [23]. У выніку, у сувязі з пераходам заходняй часткі Беларусі па Рыжскаму міру пад уладу Польшчы і захаваннем усходніх беларускіх тэрыторый у складзе РСФСР, ССРБ другога абвяшчэння і аказалася ў складзе 6 паветаў. БНР увогуле не змагла ўзяць пад кантроль якія-небудзь тэрыторыі. Да такога выніку вяла палітыка абодвух удзельнікаў польска-савецкага канфлікту 1919–1920 гг. Як справядліва адзначыў расійскі гісторык Г. Матвееў, народы, якія пражывалі паміж РСФСР і Польшчай, лідарамі гэтых дзяржаў «трактаваліся па перавазе ўтылітарна, іх меркаваннем адносна ўласнага лёсу не цікавіліся ні ў Маскве, ні ў Варшаве» [24, с. 30]. Гэтае палажэнне дакладна ілюструе сутнасць палітыкі Савецкай Расіі і Польшчы па пытанні граніц БНР і ССРБ у час польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Палітыка названых дзяржаў стала адным з важнейшых фактараў, якія перашкодзілі якой-небудзь з форм беларускай дзяржаўнасці ўсталявацца ў беларускіх этнічных граніцах.

## Літаратура


1. Бароўская, В.М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В.М. Бароўская. – Мн. : Беларуская навука, 2017. – 269 с.
2. Лазько, Р.Р. Беларуская буферная рэспубліка ў палітыцы савецкай Расіі ў пачатку 1919 г. / Р.Р. Лазько // Известия Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2006. – № 2. – С. 3–10.
3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991) : зб. дакументаў і матэрыялаў : у 4-х т. – Мн. : «Юніпак», 2008. – Т. 1, ч. 1. – 540 с.
4. Хоміч, С.М. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі (канец 1918–1926 г.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 ; 13.01.00 / С.М. Хоміч. – Мн. : БДУ, 2000. – 115 с.
5. Короткова, Д.А. Белоруссия в советско-польских отношениях в 1918–1921 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.03 / Д.А. Короткова. – М. : МГУ им. М.В. Ломоносова, 2015. – 176 с.
6. Wskreszenie Panstwa Polskiego. Szkic historyczny : w 2 t. – Kraków : Krakowska Supolka Wydawnicza, 1925. – T. 2. 1918–1923. – 300 s.
7. Wasilewski, L. Józef Piłsudski. Jakim Go znalem / L. Wasilewski. – Warszawa : Wyd. «Rój», 1935. – 235 s.
8. Piłsudski, J. Pisma zbirowe : w 8 t. / J. Piłsudski. – Warszawa : Instytut J. Piłsudskiego, 1922. – T. 5. – 297 s.
9. Czubiński, A. Walka Józefa Piłsudskiego o nowy kształt polityczny Europy Srodkowo-Wschodniej w latach 1918–1921 / A. Czubiński. – Toruń : Wydawnictwo Adam Marczałek, 2002. – 444 s.
10. Михутина, И. Польско-советская война 1919–1920 гг. / И. Михутина. – М. : Институт славяноведения и балканистики, 1994. – 322 с.
11. Документы внешней политики СССР : в 24-х т. – М. : Государственное издательство политической литературы, 1958. – Т. 2. – 804 с.
12. Мархлевский, Ю. Война и мир между буржуазной Польшей и пролетарской Россией / Ю. Мархлевский. – М. : Госуд. издат., 1921. – 43 с.
13. Краснов, В. Неизвестный Троцкий. Красный Бонапарт. Документы. Мнения. Размышления / В. Краснов, В. Дайнес. – М. : ОЛМА-ПРЕСС, 2000. – 510 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

14. Польско-советская война 1919–1920 гг. (Ранее не опубликованные документы и материалы) : в 2-х ч. – М. : ИСиБ, 1994. – Ч. 1. – 202 с.

15. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фармаванняў (1918–1922) / К. Гамулка. – Вільня : ЕГУ, 2008. – 256 с.

16. Лазько, Р.Р. Польска-савецкія мірныя перагаворы 1920 г. і лёс Беларусі / Р.Р. Лазько // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 12. – С. 5–11.

17. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1918–1920 гг.) : зб. дакументаў і матэрыялаў : у 4-х т. – Мн. : «Юніпак», 2008. – Т. 1, ч. 2. – 394 с.

18. Wojdyło, W. Traktat w Rydze w koncepcjach obozu narodowego ze szczególnym uwzględnieniem roli Stanislawa Grabskiego / W. Wojdyło // Traktat Ryski 1921 roku po 75 latach. – Toruń : Wydawnictwo naukowe UNK, 1998. – S. 47–61.

19. Польско-советская война 1919–1920 гг. (Ранее не опубликованные документы и материалы) : в 2-х ч. – М. : ИСиБ, 1994. – Ч. 2. – 234 с.

20. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14-ти т. – М. : Издательство «Наука», 1965. – Т. 3 – 609 с.

21. В.И. Ленин. Неизвестные документы. 1891–1922 гг. – М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2000. – 607 с.

22. Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939) / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін. – Мн. : Выд-ва БДУ, 2003. – 307 с.

23. Протокол № 68 от 18 ноября 1920 г. заседания политбюро ЦК РКП(б) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=57995;tab=img0091. – Дата доступа : 16.10.2017.

24. Белые пятна – черные пятна: сложные вопросы в российско-польских отношениях / Под общ. ред. А.В. Торкунова, А.Д. Ротфельда. – М. : Аспект Пресс, 2010. – 823 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 20.01.2020

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ